ЭКАНОМІКА

УДК [330.8+910](476)«192/193»

В. М. БУСЬКО, У. С. ФАЦЕЕЎ

З ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ І ГЕАГРАФІЧНАЙ НАВУКІ

(Да 100-годдзя з дня нараджэння С. П. Маргелава)

Навуковыя дасягненні ў любой краіне складаюць прадмет нацыянальнага гонару і разгля-даюцца як народны здабытак. У той жа час навуковыя дасягненні з'яўляюцца вынікам працы канкрэтных людзей. На кожным гістарычным этапе развіцця той ці іншай краіны перад на-вукай паўстаюць канкрэтныя задачы, у рашэнні якіх як поспехі, так і няўдачы адзначаюцца масай аб'ектыўных фактараў. Тым не менш і ў перыяды вялікіх прарываў у пазнанні, і ў цяжкія часы сацыяльных катастроф і навуковых застояў заўсёды асобы адыгрываюць значную ролю ў навуцы. На наш погляд, усё адзначанае вышэй можна пацвердзіць на прыкладзе на-вуковай дзейнасці прафесара С. П. Маргелава — таленавітага беларускага эканаміста-географа і чалавека з супярэчлівымі поглядамі і трагічным лёсам.

У Беларускай Савецкай Энцыклапедыі [1], выдадзенай яшчэ ў 70-я гады, змешчаны кароткі артыкул аб Сцяпане Прохаравічы Маргелаве. З гэтай і некаторых іншых біяграфічных крыніц можна даведацца вельмі мала. Звесткі аб нараджэнні (сакавік 1902 г., в. Рассохавічы Касцюковіцкага павета Магілёўскай губерні), і смерці (16 чэрвеня 1938 г., г. зн. пражыў усяго 36 год). Пасля заканчэння ў 1927 г. Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ён працаваў пад кіраўніцтвам акадэміка Г. Гарэцкага ў Беларускім навукова-даследчым інстытуце сельскай і лясной гаспадаркі. У 1930—1937 гг. прафесар Маргелаў быў загадчыкам кафедры эканамічнай геаграфіі Беларускай акадэміі навук (БАН), а затым — вучоным сакратаром Інстьпуга эканомікі БАН. Акрамя таго, у 1933—1935 гг. ён выкладаў у Інстытуце народнай гаспадаркі. Яшчэ паведамляецца, што ён з'яўляецца аўтарам прац аб размяшчэнні прамысловасці, сельскай гаспадаркі, народанасельніцтве Беларусі. Кіраваў складаннем атласа БССР. Вось і ўсё. У чым канкрэтна заключаўся навуковы ўклад гэтага вучонага? Аб гэтым у гісторыка-эканамічнай літаратуры даных не ўдалося знайсці.

Аднак па адрывачных успамінах, якія змяшчаюцца ў працах самога С. Маргелава і архіў-ных матэрыялах, можна даведацца, што ў 20 — 30-я гады ён працаваў з многімі вядомымі бе-ларускімі эканамістамі і географамі — акадэмікамі Г. Гарэцкім, Т. Домбалем, І. Пятровічам, прафесарам А. Смолічам [2; 3].

Ужо ў першай сваёй навуковай публікацыі С. Маргелаў разгледзеў вельмі важную праблему абгрунтавання размяшчэння беконных заводаў у БССР [4]. Падобныя задачы ў той перыяд часу былі актуальнымі і значнымі як для эканамічнай тэорыі, так і для гаспадарчай практыкі. У адпаведнасці з перспектыўным планам развіцця сельскай гаспадаркі, распрацаваным пад кіраўніцтвам Д. Прышчэпава ў наркамаце земляробства БССР, у якасці аднаго з прыярытэтных накірункаў развіцця сельскай гаспадаркі рэспублікі была адзначана спецыялізацыя на свінагадоўлі, і планава-лася стварыць сетку прадпрыемстваў па перапрацоўцы яе прадуктаў. Вытворчасць бекону павінна была стаць адной з экспартных вытворчасцей Беларусі, арыентаваных на збыт у Еўропе.

У сваім даследаванні Маргелаў абапіраўся на вынікі, атрыманыя раней іншымі бела-рускімі вучонымі, у прыватнасці, ён выкарыстоўваў характарыстыкі раёнаў рыначнай свінага-доўлі на тэрыторыі Беларусі, апісаныя М. Доўнар-Запольскім, С. Ждановічам, Е. Ярашчуком і Р. Бонч-Асмалоўскім. Але галоўны вынік гэтай першай працы заключаўся ў тым, што на аснове вылучанай нямецкім вучоным А. Веберам* *тэорыі штандорта (месцазнаходжання)*

* Альфрэд Вебер — брат вядомага сацыёлага Макса Вебера — у 1909 г. апублікаваў працу «О размещении промышленности: Часть 1: Чистая теория штандорта» [5], дзе ўвёў у навуковы ўжытак новае паняцце «штандорт», якое апісвае не рэальнае, а прапануемае аптымальнае месца размяшчэння (прыцягвання) вытворчасці, стварыў класіфікацыю фактараў размяшчэння вытворчасці (транспарт, рабочая сіла і агламерацыя) і паказаў механізм іх дзейнасці. У цяперашні час А. Вебера (побач з І. Г. фон Тюнэнам і В. Лаунгардтам) большасць спецыялістаў па рэгіянальнай эканоміцы адносіць да ліку заснавальнікаў, класікаў тэорыі размяшчэння вытворчасці.

гелаў адзначыў аптымальныя памеры і месца будаўніц'гва беконных заводаў у БССР. У пад-ліках за аснову былі ўзяты затраты на сыравіну, рабочую сілу і транспарт і зроблены вывад аб тым, што будаўніцтва гэтых заводаў больш мэ'газгодна ажыццяўляць у раёне рыначнай свіна-гадоўлі інтэнсіўнага тыпу, а менавіта ў Мінскай акрузе і самом горадзе Мінску. Пры абгрун-таванні велічыні завода Маргелавым былі ўлічаны вызначаныя А. Веберам так званыя *«штан-дортныя фактары»,* а таксама вопыт беканізацыі ў Польшчы, апісаны М. Тэадароўскім — польскім тэарэтыкам-эканамістам.

Новы крок у развіцці гэтага напрамку С. Маргелаў зрабіў у наступнай сваёй публікацыі, у якой пры вырашэнні праблем размяшчэння вытворчасці абгрунтоўвалася неабходнасць увязкі ўздыму сельскай гаспадаркі з прамысловым будаўніцтвам праз «рыначную змычку паміж індустрыяй і земляробствам» [6]. Прымяніўшы тэорыю штандорта да крухмальнай прамысло-васці, ён не толькі даказаў, што прадпрыемствы гэтай падгаліны з эканамічнага пункту гле-джання найбольш рацыянальна будаваць у Гомельскай і Аршанскай акругах (пераважна ў мес-цах з таннай рабочай сілай, г. зн. у сельскай мясцовасці), але і растлумачыў, як гэта станоўча будзе ўплываць на ўздым ураджайнасці ў тых месцах. Як бачым, ужо ў першых сваіх працах Маргелаў пры выбары месца для размяшчэння прамысловага прадпрыемства на канкрэтнай тэрыторыі кіраваўся крытэрыем найменшых выдаткаў вытворчасці.

Аднак найбольш важны ўклад у развіццё тэорыі размяшчэння прадукцыйных сіл С. Мар-гелаў унёс сваёй фундаментальнай працай па праблемах размяшчэння ў БССР вінакурнай прамысловасці [7]. Звяртаючы ўвагу на навуковую навіну дадзенай працы, яе рэдактар — ака-дэмік Г. Гарэцкі — адзначаў, што ні ў савецкай, ні ў беларускай эканамічнай літаратуры яшчэ не было спроб давесці тэорыю А. Вебера да канкрэтнай галіны.

Больш таго, С. Маргелаву ўдалося выйсці за рамкі тэорыі А. Вебера і разгледзець уплыў на размяшчэнне прадукцыйных сіл дадатковых фактараў — сацыяльна-палітычных і плана-вых, а таксама паказаць перспектывы развіцця ў БССР бульбаводства і вытворчасці спірту з сыравіны гэтай сельскагаспадарчай галіны. У гэты перыяд навуковай дзейнасці беларускі эканаміс'г лічыў, што без выкарыстання тэорыі штандорта размяшчаць новую вытворчасць немагчыма. «Штандортызацыя прадпрыемства ёсць вядомае прыстасаванне сумы фактараў, якія паказваюць выгаду, якую атрымлівае прадпрыемства, дзякуючы таму, што яно зна-ходзіцца менавіта тут, а не ў іншым месцы» [7, с. 27].

С. Маргелаў у адрозненне ад А. Вебера размежаваў штандортныя фактары на дзве групы: тыя, якія залежаць ад характару самой вінакурнай прамысловасці і не зазналі істотных змен пасля 1917 г. (г. зн. па сутнасці рыначныя фактары), і тыя, якія носяць палітыка-эканамічны характар. Да сацыяльных фактараў ён аднёс канцэнтрацыю дзяржавай гэтай галіны і адсут-насць канкурэнцыі, што, на яго погляд, дазваляла ў планавым парадку размяшчаць заводы ў тых месцах, дзе найбольшая выгада з пункту гледжання эканамічнай палітыкі, якая праводзі-лася дзяржавай.

Пры правядзенні гэтага даследавання Маргелаў асноўную ўвагу ўдзяліў сабекошту. Аналіз дынамікі размяшчэння спіртавых заводаў, а таксама затрат на вытворчасць дазволіў зрабіць вывад аб мэтазгоднасці набліжэння пунктаў размяшчэння прадпрыемстваў да асноўнай і най-больш рэнтабельнай ва ўмовах БССР крыніцы сыравіны — бульбы. Былі таксама адзначаны раёны выгаднага размяшчэння гэтых заводаў — у Магілёўскай, Гомельскай і Мазырскай акругах, а таксама паказана, што ў Полацкай і Віцебскай акругах лакалізацыя дадзенай вытвор-часці не мае перспектыў, паколькі там моцна развіты льнаводства, малочная жывёлагадоўля і свінагадоўля.

Такім чынам, С. Маргелавым, несумненна, быў зроблены важны ўклад у развіццё тэорыі і практыкі размяшчэння вытворчасці. Ім адным з першых былі атрыманы прыкладныя вынікі, заснаваныя на адаптацыі шэрагу палажэнняў тэорыі А. Вебера да канкрэтных галін беларускай эканомікі. Аналіз ранейшых прац С. Маргелава, а таксама іншых беларускіх аўтараў сведчыць аб тым, што ў канцы 20-х гадоў XX ст. эканамічная і геаграфічная навука ў БССР і СССР у цэлым знаходзілася на вельмі высокім узроўні, што параўноўваецца з пера-давымі краінамі. Тут трэба прывесці адзін знамянальны факт. Кніга А. Вебера па тэорыі штандорта, надрукаваная ў Германіі, як ужо адзначалася вышэй, у 1909 г., у СССР была вы-дадзена на рускай мове ў перакладзе Н. Марозава ў 1926 г. [8], у той жа час ў англійскім пе-ракладзе ў ЗША яна з'явілася толькі ў 1929 г. [9]. Да гэтага часу С. Маргелаў з выкарыстан-нем палажэнняў тэорыі Вебера ўжо не толькі правёў свае даследаванні, але і паспеў апублі-каваць адзначаныя вышэй тры дастаткова вялікія працы.

Аднак трэба прызнаць, што С. Маргелаў, выканаўшы ў самыя першыя гады сваёй даслед-чыцкай кар'еры некалькі «піянерскіх» прац вялікай навуковай значнасці, вельмі хутка «ад-

хрышчваецца» ад тэорыі Вебера, тым самым фактычна адмаўляючыся ад многіх сваіх раней-шых вынікаў. Яго працы становяцца ўсё больш палітызаванымі, некаторыя з іх (найбольш познія) адрозніваюцца бальшавіцкай лозунгавасцю, апісальнасцю, мноствам спасылак на класікаў марксізму-ленінізму, як, зрэшты, і публікацыі многіх іншых вучоных, працаваўшых утой складаны гістарычны перыяд.

У канцы 20-х гадоў С. Маргелаў прыняў удзел у ідэалагічным абгрунтаванні і падтрымцы адзначанага партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам СССР курсу на фарсіраваную індустрыялізацыю і калектывізацыю. У прыватнасці, у сваіх працах ён сканцэнтраваў увагу на крытыцы эканамічнай праграмы так званай *«белорусской кондратьевщины»* (у беларускім друку яе яшчэ называлі *«прищеповщина», «кисляковщина»,* у больш шырокім сэнсе — нацыянал-дэмакратычны накірунак у тэорыі і практыцы гаспадарання ў БССР як форма праяўлення «правага ўхілу» ў партыі).

Ужо ў 1929 г. з'явілася яго рэцэнзія ў друкаваным органе ЦК КП(б)Б — часопісе «Большевик Белоруссии», прысвечаная аналізу працы М. Лайкова "Нарыс па грамадзянскай аграноміі Беларусіі» [10]. Выступаючы ў ролі крытыка, Маргелаў спыніўся на адным з наЙ-больш дыскутуемых у той перыяд часу пытанняў у партыйна-эканамічнай літаратуры СССР, а менавіта на прапарцыянальным развіцці сельскай гаспадаркі і прамыоловасці, абгрун-тоўваючы памылковасць палажэння Лайкова аб залежнасці росту буйной індустрыі ад сель-скай гаспадаркі, якая разглядалася як сыравінная база прамысловага будаўніцтва. Паводле меркавання Маргелава, гэты аўтар не ўлічваў, што сельская гаспадарка, па-першае, э'яўляецца адначасова рынкам збыту для прамысловасці, а не толькі рынкам сыравіны, а, па-другое, існуе адваротная залежнасць — «развіццё сельскай гаспадаркі ў сувязі з развіццём прамысло-васці», паколькі асноўнуюролю ў рэканструкцыі адыгрывае новая тэхніка.

У «Большевике Белоруссии» быў апублікаваны яшчэ адзін артыкул С. Маргелава з кры-тычным аналізам навукова-даследчай працы ў галіне эканомікі сельскай гаспадаркі, якая праводзілася ў БССР у 20-я гады [11]. Звяртае на сябе ўвагу яго сцверджанне аб поунай адсутнасці ў царскі час усялякай навукова-даследчай працы на тэрыторыі Беларусі і статыстычных матэрыялаў, акрамя даследаванняў Ф. Ястрэмскага (у канцы XIX — пачатку XX ст. быў кіраўніком Мінскай казённай палаты)*, а таксама адсутнасці арганізацыйнага аб'яднання, планавання і ідэалагічнага кіравання ў галіне эканомікі сельскай гаспадаркі ў 20-я гады ў БССР. У якасці прыкладу апошняга ён спыніўся на дзейнасці аддзела сельскагаспадарчай эканоміі (А. Смоліч) Беларускага навукова-даследчага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі, які ўзна-чальваў Г. Гарэцкі. Яго крытыка зводзілася да даследавання супрацоўнікамі інстытута індыві-дуальных сялянскіх гаспадарак (працы Ліодта, Кіслякова, Макарава), сувязі сельскай гаспа-даркі з рынкам (працы Ждановіча), грамадскай аграноміі (працы Лайкова), якія па сутнасці, як лічыў Маргелаў, былі шкодныя для сацыялістычнага будаўніцтва і насілі буржуазны, эклек-тычны характар. Абурэнне крытыка выклікала нават імкненне Г. Гарэцкага *і* А, Смоліча ў сваіх планах пачаць распрацоўку чыста тэарэтычных праблем, увязаных 3 «развіццём сусветнай эканамічнай думкі».

3 пазіцыі сённяшняга дня такія абвінавачванні, канешне, здаюцца дзіўнымі, але яны ха-рактарызавалі «дух часу», імкненне стварыць новае грамадства, альтэрнатыўнае капіталістычнаму і якое базіравалася б на прынцыпова новай эканамічнай тэорыі, якая атрымала ў далей-шым назву «палітэканомія сацыялізму». Гэта праявілася, у прыватнасці, ў абгрунтаванні Мар-гелавым напрамкаў рэарганізацыі ўсёй навукова-даследчай працы ў БССР, сярод якіх най-больш важнай стала арыентацыя на абслугоўванне запатрабаванняў не індывідуальных ся-лянскіх гаспадарак, а сацыялістычных форм (саўгасаў, калгасаў), што патрабавала змянення тэматыкі даследаванняў, падрыхтоўкі кадраў праз аспірантуру і г. д.

3 працы С. Маргелава «Супроць беларускай кандрацьеўшчыны» [12]» апублікаванай у 1930 г., атрымліваецца, што ён яшчэ ў 1928 г. ананімна напісаўдзве рэцэнзіі (адна з іх у сааўтарстве з Г. Бондарам) у «Большевике Белоруссии» на кнігу А. Смоліча «Арганізацыя сялянскай гас-падаркі ў раёнах Цэнтральнай Беларусі», у якіх абвінаваціў аўтара ў Неанародніцтве пры сель-скагаспадарчым раяніраванні БССР. А пазней Маргелаў паставіў пад сумненне сцверджанне Смоліча, што ён раней А. Котава і Г. Студзенскага пры практычным раяніраванні прымяніў паказчык валавога і чыстага прыбытку, лічачы першынство ў гэтым метадзе за У. І. Леніным. Аднак нельга не адзначыць, што яшчэ ў 1930 г. Маргелаў станоўча выказаўся аб працы

* Нагадаем, што Г. Гарэцкі, А. Смоліч і некаторыя іншыя беларускія эканамісты і географы пры крытычных адносінах да царскай палітыкі адносна Беларусі ўсё ж не адмаўлялі даволі высокага узроўню развіцця па асобных накірунках эканомікі сельскай гаспадаркі як навукі.

Смоліча «Сельскагаспадарчыя раёны БССР у 1927—1928 гг.» (Мн., 1930), назваўшы яе карыс-най для сацыялістычнага будаўніцтва.

Акрамя крытычнага аналізу працы Інстытута сельскай і лясной гаспадаркі, С. Маргелаў зрабіў аналагічны агляд дзейнасці кафедр геаграфіі і штандорта БАН, загадчыкамі якіх з'яўляліся адпаведна А. Смоліч і Г. Гарэцкі [13] (сімвалічна, што ў той час Маргелаў працаваў у складзе ***брыгады па чыстцы БАН)***. Па-першае, стварэнне дзвюх кафедр, блізкіх па сваёй тэматыцы, ён абгрунтаваў як спробу «правесці ў акадэмікі двух махровых контррэвалюцыяне-раў — А. Смоліча і Г. Гарэцкага». Па-другое, падрабязна разгледзеўшы распрацаваныя пер-спектыўныя планы НДР гэтых вучоных, ён іх ахарактарызаваў як буржуазныя. У Гарэцкага аб гэтым, па меркаванню крытыка, сведчылі: падзел эканамічнай геаграфіі на тэарэтычную і практычную часткі, што нібыта вядзе да адрыву ад сацыялістычнага будаўніцтва; вывучэнне існуючых штандортаў; планаванне камандзіроўкі ў Германію да Альфрэда Вебера з мэтай вы-вучэння лепшых буржуазных тэорый штандорта і г. д. У Смоліча гэта: эканамічнае раяніра-ванне пры дапамозе вывучэння геаграфічнай сферы, даследаванне такіх тэм, як, напрыклад, «Беларуская эміграцыя ў Амерыку», што нібыта з'яўляецца адрывам тэорыі ад практыкі і г. д.

А. Смоліч і Г. Гарэцкі абвінавачваліся таксама ў тым, што з'яўляліся манапалістамі ў гэтай працы, не рыхтавалі аспірантаў, а іх даследаванні па штандорту і эканамічнаму раяніраванню базіраваліся на буржуазнай метадалогіі А. Вебера і створаных капіталістычнай эвалюцыяй ты-пах сельскай гаспадаркі, не улічваючы рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Акрамя 'таго, Г. Гарэцкі абвінавачваўся ў вылучэнні ролі Беларусі ў вывучэнні сельскай гаспадаркі, асабліва яе першын-ства ў СССР. Перад зліццём названых вышэй дзвюх кафедр у адну — кафедру эканамічнай геафафіі, адзначаныя крытыкі (у тым ліку С. Маргелаў) паставілі ў якасці асноўнай задачы падрыхтоўку новых падручнікаў па фізічнай і эканамічнай геаграфіі, а таксама дакладнаму вывучэнню БССР у фізічных і эканамічных адносінах.

У 1930 г. С. Маргелаў апублікаваў кнігу [14], мэта якой заключалася ў абгрунтаванні «гіста-рычнай неабходнасці сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі ў выглядзе саўгасаў і калгасаў». У сваім даследаванні ён паказаў, што ў параўнанні з Еўрапейскай Расіяй, не ка-жучы ўжо пра Заходнюю Еўропу, Беларусь да 1917 г. па ўдзельнай вазе сельскага насельніцтва ў агульным насельніцтве, па ўдзельнай вазе сельскай гаспадаркі ў так званым «народным да-ходзе» займала 1-е месца, а па народным даходзе на душу насельніцтва значна адставала не толькі ад Захаду (73 руб. супраць 292 руб. у Германіі і 463 руб. у Англіі), але і ад Еўрапейскай часткі Расіі (101 руб.). Як прынята ў том перыяд, асноўнай прычынай галечы і забітасці бела-рускага насельніцтва ён лічыў каланіяльную палітыку царызму. У працы былі выкрыты асаб-лівасці паслярэвалюцыйнага развіцця беларускай сельскай гаспадаркі, якія сведчаць аб тэн-дэнцыі паляпшэння ўзроўню жыцця і інтэнсіфікацыі, «абсераднячвання» беларускай вёскі. Разам з тым НЭП не прывёў, на яго погляд, да таго, каб сельская гаспадарка развівалася як прамысловасць, паколькі індывідуальныя, дробныя сялянскія гаспадаркі не ў стане карды-нальна забяспечыць высокі эканамічны рост. Як выхад — перавод сельскай гаспадаркі на буйныя формы, паказаўшы статыстычным шляхам эканамічныя выгады такога кроку: зніжэн-не сабекошту, павышэнне ўраджайпасці, магчымасць выкарыстання тэхнікі і г. д. У папулярнай форме ён выклаў існуючыя формы калектыўных гаспадарак: саўгасы і калгасы, якія ў сваю .чаргу падзяляюцца на камуны, арцелі і ТАЗы. Гэта праца насіла яўна прапагандысцкі характар.

З пачатку 30-х гадоў С. Маргелаў даследаваў у асноўным тры цесна звязаныя навуковыя праблемы: эканамічнае раяніраванне, перспектывы развіцця сельскай гаспадаркі і складанне падручніка па эканамічнай геаграфіі БССР. Пачатак гэтаму быў пакладзены экспедыцыяй у Дубровенскі раён і бліжэйшыя цэнтры, у склад якой уваходзілі яе кіраўнік М. Лойка, С. Маргелаў, В. Самцэвіч і інш. Яна была арганізавана секцыяй эканамічнай геаграфіі Інстытута эканомікі БАН сумесна з акадэмічнымі інс'гытугамі мовазнаўства і г'історыі, а таксама Цэнтральным бюро краязнаўства (ЦБК) [15]. У якасці галоўнай задачы экспедыцыі ставілася вывучэнне прамысловасці раёна і яго ўплыву на рэканструкцыю сельскай гаспадаркі і збору матэрыялаў для падручніка па эканамічнай геаграфіі.

Пры рашэнні праблемы эканамічнага раяніравання БССР С. Маргелаў сумесна з М. Лой-кам першапачаткова звярнулі ўвагу на метадалагічны аспект, крытычна разгледзеўшы тэарэ-тыка-практычныя падыходы сваіх папярэднікаў [16]. За аснову імі былі ўзяты ўстаноўкі І. Сталіна аб наяўнасці разрыву наміж нрактычнымі поспехамі сацыялістычнага будаўніцтва і развіццём тэарэтычнай думкі, неабходнасці вызваліцца ў тэорыі ад «буржуазнага хламу» і пе-раходзе на марксісцка-ленінскія пазіцыі. Таму яны бачылі галоўную задачу эканамічнай геа-графіі ва ўзмацненні практычнай накіраванасці ў сацыялістычным будаўніцтве, вылучыўшы

спецыфічную рысу гэтай навукі — вызначэнне перспектыў спецыфікацыі і прасторавага раз-мяшчэння народнай гаспадаркі ў цэлым і асобных галін, г. зн. «стаць тэорыяй эканамічнага раяніравання». З такога пункту гледжання С. Маргелаў і М. Лойка прааналізавалі існуючыя ў дарэвалюцыйнай Расіі і СССР 20-х гадоў падыходы да праблемы раяніравання. Да асаблі-васцей дарэвалюцыннага перыяду беларускія вучоныя аднеслі чыста пазнавальны характар таго раяніравання, якое праводзілася па фактарах, адрыў эканамічных раёнаў ад адміністра-цыйных, упор на эвалюцыйнае, а не рэвалюцыйнае эканамічнае развіццё і г. д. Крытыкуючы гэтыя падыходы, беларускія аўтары паспрабавалі абгрунтаваць новыя метадалагічныя прын-цыпы эканамічнага раяніравання, сярод якіх уплыў грамадскіх адносін на развіццё прадук-цыйных сіл, а не толькі геаграфічнага асяроддзя, найбольш важнае значэнне пры размяш-чэнні вытворчасці пралетарскай дзяржавы і планавання. Яны сфармулявалі новае азначэнне эканамічнага раёна — «спецыялізаваны вытворчы камбінат, які ўключае ў сябе народнагаспа-дарчую дзейнасць па сацыялістычнаму будаўніцтву на канкрэтна вызначанай тэрыторыі, — камбінат, які выконвае канкрэтныя функцыі ў сістэме тэрытарыяльнага падзелу грамадскай працы».

Абапіраючыся на выказванні І. Сталіна, С. Маргелаў і М. Лойка паспрабавалі абгрунта-ваць новыя напрамкі ў навукова-даследчай працы ў БССР у галіне эканамічнага раяніраван-ня, звярнуўшы асаблівую ўвагу на недапушчальнасць калейдаскапічнай змены спецыялізацыі раёнаў, а таксама на неабходнасць упору на агульнаэканамічнае раяніраванне ў працэсе сацыя-лістычнага будаўніцтва, г. зн. трэба разглядаць раён не ў якасці механічнай, а арганічнай сас-таўляючай усёй народнай гаспадаркі. Імі ў агульных рысах былі ахарактарызаваны і этапы такой працы: ацэнка прыроднай асновы развіцця прадукцыйных сіл, месца БССР у сістэме тэрытарыяльнага падзелу грамадскай працы, ікіцыятыва асобных даследчыкаў, наяўнасць плана-мернай арганізацыі працы і марксісцкай метадалогіі. С. Маргелаў і М. Лойка не пагадзіліся са сцверджаннем Н. Баранскага, паводле якога значная колькасць спроб дарэвалюцыйнага раяніравання Расіі абумоўлена яе вялікай тэрыторыяй і разнародным характарам. Спыніў-шыся на ацэнцы паслярэвалюцыннага раяніравання ў БССР, яны лічылі ў якасці недахопу перавагу даследаванняў буржуазнага толку, падрабязна разгледзеўшы працы сваіх папярэдні-каў — Н. Ярашэвіча, А. Смоліча і перспектыўны план развіцця сельскай і лясной гаспадаркі, распрацаваны наркаматам земляробства.

З мэтай доказу гэтага С. Маргелаў і М. Лойка падрабязна разгледзелі погляды такіх расій-скіх вучоных, як А. Ф. Фартунатаў, А. І. Скварцоў, А. Н. Чалінцаў, Б. Н. Кніповіч, Н. Нікіцін, А. В. Чаянаў*, зрабіўшы вывад аб тым, што іх падыходы базіраваліся на агульных метада-лагічных перадумовах, названых дробнабуржуазнымі: стаўка на адну якую-небудзь галіну (пе-раважна на сельскую гаспадарку), сцверджанне аб немагчымасці рэальнага вызначэння кан-крэтнага раёна, адсутнасць сувязі паміж прыродна-гістарычнымі і сацыяльна-эканамічнымі фактарамі.

Сваё бачанне тэарэтыка-метадалагічных праблем эканамічнага раяніравання і эканаміч-най геаграфіі ў цэлым С. Маргелаў у той перыяд таксама выклаў пры напісанні рада рэцэнзій на кнігі вядомых расійскіх эканомгеографаў А. Цімашова і Г. Чарданцава [18; 19]. Пры рэцэн-заванні кнігі А. Цімашова ён звярнуў увагу на яго сцверджанне наконт немагчымасці ў сувязі з невялікай практыкай эканамічнага раяніравання мець адну ўстаноўленую метадалогію, хаця ў працэсе асабістага даследавання прытрымліваўся апартунісцкай, эвалюцыйнай тэорыі Чая-нава — Кандрацьева па планаванню, абвяргаючы тым самым марксісцка-ленінскі метад. Другі адмоўны момант даследавання гэтага аўтара рэцэнзент угледзеў у апісанні асобных раё-наў без сувязі галін паміж сабой. Гэта дало падставу С. Маргелаву гаварыць аб шкоднасці пе-ракладу на беларускую мову гэтай кнігі.

Больш разгорнутая крытыка і абгрунтаванне асабістых падыходаў да праблемы эканаміч-нага раяніравання былі сфармуляваны пры напісанні рэцэнзіі на кнігу Г. Чарданцава, увязаўшы гэту праблему з працэсам сацыялістычнага планавання. Тут ён абапіраўся на ўказанні У. І. Леніна і 1. В. Сталіна аб тым, што матэрыяльнай асновай сацыялізму з'яўляецца буйная машынная прамысловасць на моцнай энергетычнай базе, а таксама вядучая роля ў сацыялістычнай рэ-канструкцыі і спецыялізацыя асобных раёнаў індустрыі. Як і ў рэцэнзіі на працу М. Лайкова, С. Маргелаў абвінаваціў Г. Чарданцава ў няправільным разуменні сувязі сельскай гаспадаркі з іншымі галінамі, пры разглядзе сельскай гаспадаркі ў якасці самаразвіваючагася сектара эканомікі, ігнаруючы тым самым вядучую ролю сацыялістычнай прамысловасці пры размяш-

* Падрабязна аб поглядах і ўкладзе гэтых пучоных у развіццё метадалогіі і тэорыі эканамічнага раяніравання гл. [17].

чэнні і спецыялізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Такі падыход ён назваў праяўленнем механіцызму ў эканамічным раяніраванні*.

У той жа рэцэнзіі С. Маргелаў падрабязна разгледзеў тэарэтычныя праблемы спецыялі-зацыі народнай гаспадаркі, якія з'яўляліся, на яго погляд, цэнтральнымі ў эканамічнай геа-графіі як навуцы. ЁН лічыў, што паняцце «спецыялізацыя» Г. Чарданцаў пераняў у Н. Баранскага, паколькі разглядаў спецыялізацыю ў якасці аб'ектыўнага працэсу, абстрагуючыся ад сацыяльна-эканамічных умоў і не бачачы розніцы пры капіталізме і пры сацыялізме.

Другі метадалагічны парок у абодвух указаных аўтараў С. Маргелаў бачыў у іх сцверджанні, што спецыялізацыя заўсёды адбываецца мірным шляхам, тады як у рэчаіснасці пры капіталізме, яна ажыццяўляецца стыхійна на базе антаганістычных супярэчнасцей, а. пры са-цыялізме — у планавым парадку пры абвастрэнні класавай барацьбы з рэшткам» капіталізму. У якасці аргументаў беларускі вучоны выкарыстаў усё той жа прыём — спасылкі на К. Маркса, Ф. Энгельса і І. Сталіна.

Інтарэс таксама прадстаўляе спроба С. Маргелава абгрунтаваць блізкасць поглядаў Н. Ба-ранскага, Г. Чарданцава, Б. Когана, В. Вінэра да буржуазных канцэпцый сусветнага экана-мічнага развіцця тыпу натурфіласофіі, мальтузіянства, геапалітыкі і г. д., якія апраўдваюць супярэчнасці ў капіталістычным свеце «прыроднымі ландшафтамі». Калі прытрымлівацца такіх установак, як лічыў Маргелаў, БССР будзе заўсёды адсталай у эканамічных адносінах ускраінай СССР.

У заключэнні ўказанай рэцэнзіі С. Маргелаў выступіў з крытыкай поглядаў Г. Чарданцава і Н. Баранскага на значэнне эканамічнай геаграфіі як навукі. Паводле меркавання Маргелава, у задачу марксісцка-ленінскай эканамічнай геаграфіі ва ўмовах капіталізму, павінны ўвахо-дзіць пошук адказу на тыя патрабаванні, што прад'яўляе сусветны пралетарыят, паказ абваст-рэння супярэчнасцей, іх асаблівасцей у кожнай краіне і рэгіёне, якія забяспечылі б перамогу над капіталізмам. Ён лічыў, што эканамічная геаграфія СССР павінна адказваць на запатра-баванні сацыялістычнага будаўніцтва, г. зн. стаць «навукай пра планавае геаграфічнае раз-мяшчэнне сацыялістычных прадукцыйных сіл на прасторах СССР увогуле і ў яго асобных раёнах у прыватнасці».

На прыкладзе выкананага С. Маргелавым крытычнага аналізу існаваўшых у 20-я гады па-дыходаў у эканоміка-гёаграфічнай літаратуры СССР вельмі добра праглядаюцца характэрныя рысы фарміравання так званай марксісцка-ленінскай эканамічнай геаграфіі ў БССР, якая стала базіравацца на партыйных установках, яўным вылучэнні ў паняційна-катэгарыяльным апараце сацыяльна-класавых момантаў, варожасці да распрацовак папярэднікаў і ігнараванні дасягненняў даследчыкаў на Захадзе. 1 факт актыўнага ўдзелу С. Маргелава ў гэтым працэсе — цалкам відавочны. Тым не менш было б неаб'ектыўным сцвярджаць, што ўся навукбвая дзейнасць гэтага беларускага вучонага, што адносіцца да 30-х гадоў, заслугоўвае толькі нега-тыўнай ацэнкі.

У 1932 г. у адпаведнасці з урадавым заданнем Інстытут эканомікі БАН сумесна з Дзярж-планам БССР і ЦБК прыступіў да выканання вялікай і вельмі важнай па свайму тэарэтычнаму і практычнаму значэнню планавай тэмы па эканоміка-геаграфічнаму апісанню раёнаў БССР. 3 гэтай мэтай была створана спецыяльная камісія на чале з І. Пятровічам**, членам якой быу і С. Маргелаў. Калі Т. Домбаль распрацаваў агульныя метадалагічныя падыходы да рашэння гэтай праблемы [20], то С, Маргелаў і М. Лойка на іх асновё — канкрэтную пр'агра-му па апісанню раёнаў БССР [21].

Першыя вынікі міждысцыплінарнай працы былі выкладзены ў. выдадзенай Інстытутам эканомікі ў 19,33 г. калектыўнай манаграфіі пад рэдакцыяй акадэміка Т. Домбаля «Усе раёны БССР» [22]. У яе напісанні прынялі ўдзел такія вядомыя беларускія вучоныя розных спецы-яльнасцей, як акадэмікі і прафесары Кайгарадаў, Афанасьеў, Красоўскі, Дарожкін, Бахцееў, У той жа манаграфіі С. Маргелаў змясціў цікавы (нават з пазіцый сучаснай геаграфічнай на-вукі) артыкуд «Физико-географмческая карта БССР м зональные экономические подрайоны БССР», дзе прадставіў падрабязную характарыстыку па чатырох занальных раенах БССР:
Віцебска-Аршанска-Полацкаму, Мінска-Бабруйска-Барысаўскаму, Мазырска-Турава-Рэчыц-каму і Гомеле-Магілёва-Крычаўскаму, выдзеліўшы іх спецыялізацыю.

Назапашванне матэрыялаў дазволіла ў 1936 г. выдаць вучэбны дапаможнік «Экономиче-ская география БССР» [23] — першую падобнага роду працу, выдадзеную з часу ўтварэння

* У савецкай эканамічнай навуцы пачатак 30-х гадоў праншоў пад сцягам крытыкі механістычнага падыходу ў эканамічных даследаваннях.

** Хутка гэта камісія была пераўтворана і яе старшынёй прызначаны Т. Домбаль.

Беларускай ССР. Яе адказным рэдактарам быў прафесар Я. Ракаў, які стаў незадоўга да гэ-тага дырэктарам Інстытута эканомікі БАН, а кіраваў аўтарскім калектывам С. Маргелаў, які з'яўляўся ў той час загадчыкам эканоміка-геаграфічнай секцыі гэтай установы. Ён жа нагіісаў значную частку падручніка, у тым ліку па Заходняй Беларусі. У гэтай працы была сабрана вялікая колькасць свежых даных па фізічнай і эканамічнай геаграфіі БССР, таму яна была добра вядома ў іншых рэспубліках СССР. Тым не меншу гэтым дапаможніку, як і ў іншай вучэбнай літаратуры эпохі шпіёнаманіі, пошуку «ворагаў» і «шкоднікаў», масавых сталінскіх рэпрэсій, было вельмі многа характэрных бальшавіцкіх лозунгаў, а таксама агульных і перса-нальных палітычных абвінавачванняў.

У заключэнне можна сказаць наступнае: нягледзячы на тое, што практычна ва ўсіх апошніх працах прафесара С. Маргелава прысутнічаюць падыходы, характэрныя для бальшавіцкай ідэалогіі, яго жыццёвы шлях, як і большасці супрацоўнікаў БАН 30-х гадоў, скончыўся трагічна. Архіўныя матэрыялы сведчаць аб супярэчлівых даных адносна прычын і дакладнай даты смерці С. Маргелава. Калі ў архіве НАН Беларусі ёсць копія пасведчання пра яго смерць 16 чэрвеня 1938 г. з указаннем прычыны — туберкулёз лёгкіх [24], то па іншых крыніцах ён быў 23 сту-дзеня 1937 г. асуджаны па артыкулах КК БССР і 29 кастрычніка 1937 г. расстраляны [25].

Summary

The paper is devoted to contribution of professor S. P. Margelaw into Belarusian economic-geographic research school. He was one of the first in Soviet economic literature to apply the «standort» theory to location of various industrial enterprises. Evolution of his views on problems of regional economic distribution in Belarus is demonstrated. His role in preparing manual «Economic geography of the Byelorussian S.S.R.» and compiling national atlas is stressed.

Літаратура

1. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. Мн., 1973. Т. 7. С. 13
2. Институт экономики Национальной академии наук Беларуси. 1931—2001 / Под ред. П. Т. Никитенко, В. С. Фатеева. Мн., 2001.
3. Н и к и т е н *к о* П. Г., Б у с ь к о В. Н. Они были первыми академиками-экономистами Беларуси. Мн., 2001.
4. М а р г е л а у С. Да пытання аб штандорце беконных заводау на БССР // Сельское и лесное хозяйство. Мн., 1927. Кн. 3. С. 35-46.
5. W e b e r A. Uber den Standort der Industrien. Teil 1: Reine theorie des Standorts. Tubingen: J. C. B. Mohr, 1909.
6. М а р г е л а у С. Праблема ураджайнасці у сувязі з развіццём штандорта сельскагаспадарчай індустрыі БССР // Сельское и лесное хозяйство. Мн., 1928. Кн. 7. № 5— 6. С. 82-90.
7. М а р г с л а у СП. Броварная прамысловасьць і яе штандорт на тэрыторыі сучаснай БССР (1884—1927 гг.) / Пад рэд. Г. І. Гарэцкага. Мн., 1928.
8. В е б е р А. Теория размещения промышленности / Изл. и пер. Н. Морозова. Л.; М., 1926.
9. Alfred Weber's Theory of the Location of Industries, translated by C. J. Friedrich. Chicago: University of Chicago Press, 1929.
10. М а р г е л а у С. Супроць беларускае кандрацьеушчыны // Бальшавік Беларусі. Мн.,.1929. № 10—12. С. 116-123.
11. М а р г е л а у С. Дасьледчая справа у галіне с. -г. эканоміі на БССР // Бальшавік Беларусі. 1930. № 6—7. С. 30-39.
12. М а р г е л а у С. П. Супроць беларускай кандрацеушчыны. Мн.: БДВ, 1930.
13. Н і к а л а е у А., Л о й к а М., Маргелау С. Нацдэмаўская праца катэдры геаграфіі БАН (па матэ-рыялах брыгады па чыстцы БАН) // Савецкая краіна. Мн., 1931. № 3. С. 31—37.
14. М а р г е л а у С. Калгасы - адзіны шлях сялянства. Мн.: БДВ, 1930.
15. Хроніка // Савецкая краіна. 1931, № 5. С. 86.
16. Л о й к а М. І., Маргелау С. П. Эканамічнае раёнаванне БССР (Крытычны нарыс па мэтадалогіі раянавання) // Савецкая краіна. 1931. № 6. С. 9—27.
17. С а у ш к и н Ю. Г. Экономическая география: история, теория, методы, практика. М.: Мысль; 1973.
18. Л о й к а М., Мар г ел а у С. Шкодная кніжка. А. Цімашоу. Эканамічныя нарысы раёнау і іх мэтодо-лёгія / Пад рэд. В. Серафімава. Мн.: БАН, 1931 // Савецкая краіна.1931. № 11. С. 66—67.
19. М а р г е л а у С. Супроць буржуазных скажэньняу эканомічнае географіі // Савецкая краіна. 1932. № 2. С. 58-72.
20. Домбаль Т. Ф. Праграма комплекснага эканамічнага вывучэння раёнау БССР. Мн.; БАН, 1933.
21. М а р г с л а у С., Л о й к а М. Праграма эканоміка-геаграфічнага апісання раёнау БССР // Савецкая краіна. 1932, № 3. С. 50-63. і
22. Усе раёны БССР / Пад рэд. акад. Т. Ф. Домбаля. Мн,: БАН, 1933.
23. Эканамічная геаграфія БССР / Адк. рэд. Я. Ракау. Мн.: БАН, 1936.
24. Архив НАН Беларуси, ф. 2, оп. 1, д. 3980.
25. Возвращенные имена. Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репрессий. Мн., 1992.

Інстытут эканомікі
НАН Беларусі

Паступіу у рэдакцыю
11.09.2001